# ДА 215-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. МАКСІМІЛІЯНА РЫЛА




**Гавань Бейрута, пачатак XIX стагоддзя; партрэт М. Рылы ва ўсходнім строі (віртуальная паштоўка Алеся Перагудава, 2017 год).**

***Максіміліян Станіслаў Рыла*** (*айцец Максіміліян*, расейск. *Максимилиан Рылло*, польск. *Maksymilian Stanisław Ryłło*; *31.12.1802*, вёска Падароск Ваўкавыскага уезду – *17.06.1848*, Хартум). Каталіцкі місіянер на Бліжнім Усходзе, філосаф, археолаг, арыенталіст. Першым даследваў парэшткі старажытнага Бабілона (Вавілона) і ахвяраваў музею Ватыкана багатую калекцыю артэфактаў. З 1839 г. на Бліжнім Усходзе. Стварыў у Бейруце Азіацкі каталіцкі калегіўм (1841 г., які ў 1875 г. пераўтвораны ў Бейруцкі ўніверсітэт св. Язэпа/Іосіфа. Апостальскі вікарый Цэнтральнай Афрыкі ў Хартуме (з 1846 г.).

Пра гэтага яскравага, з надзвычай моцнай пасіянарнасцю чалавека (чаго варты адзін толькі эпітэт *A. Karola* ў адносінах да яго – *"езуіт-рамантык»!*) можна напісаць раман, не меньш захапляльны за вядомыя жыццяпісанні першаадкрывальніка Троі *Генры Шлімана*. Але ж нават імя *Максіміліяна Рылы* знойдзецца далёка не ў кожнай энцыклапедыі, і таму ў нашым Прынямонні, ў лепшым выпадку, яно вядома толькі вузкаму колу спецыялістаў.



Максіміліян Станіслаў Рыла нарадзіўся 19 снежня стст. 1802 г. у вёсцы Падароск Ваўкавыскага уезда Гродзенскай губерні ў збяднелай шляхецкай сям'і. Да сёняшняга дня захаваўся хрысціянскі храм (зараз царква), у якім верагодна нованароджаны быў ахрышчоны на пачатку 1803 г. ў каталіцтва (па сукупнасці сённяшніх дадзеных, на той час гэта быў яшчэ

рыма-каталіцкі касцёл). Зараз гэта праваслаўная царква (“Храм Святой Живоначальной Троицы”; год пабудовы 1780).



**Падароск. Былая сядзіба Чачотаў-Бохвіцаў.**

Дзіцячыя гады М. Рыла прайшлі сярод маляўнічай прыроды Ваўкавышчыны.

Ён атрымаў грунтоўную пачатковую адукацыю, скончыўшы ў 1817 г. вядомую далёка за межамі Прынямоння валасную школу ў вёсцы Лыскова Пружанскага уезда. Па заканчэнні Полацкай езуіцкай акадэміі атрымоўвае ступень магістра філасофіі. У 1820 г. пачынае вучобу на медыцынскім факультэце Віленскага ўніверсітэта. У сувязі з забаронай у Расейскай імперыі дзейнасці езуітаў, уязджае ў Рым, дзе ў 1824-26 гг. і 1830-34 гг. працягвае вучобу ў Папскім Грыгарыянскім універсітэце, вывучаючы там філасофію і тэалогію. У 1833 г. становіцца каталіцкім святаром. Атрымоўвае званне прафесара філософіі, пасля чаго выкладае ў езуіцкіх школах.

У 1836 г. выпраўляецца ў Ліван для вывучэння магчымасці аб’яднання цэркваў і адкрыцця каталіцкай акадэміі на Бліжнім Усходзе. Як інспектар Ватыкана, наведвае Малую Азію. У снежні 1837 г. у Ерусаліме сустракаецца з польскім паэтам *Юльюшам Славацкім* (1809-1849), некаторы час яны вандруюць разам. У красавіку 1837 г. Максіміліян Рыла наведвае Дамаск, Багдад, Масул і Ніневію. Адначасова з сустрэчамі з прадстаўнікамі усходніх цэркваў, ён здзейснівае археалагічныя вышукі. У гэтым жа 1837 г. абіраецца ў папскую археалагічную акадэмію і Арыенталагічнае таварыства Францыі. На прыканцы 1837 г. вяртаецца ў Рым, дзе грунтоўна дакладае папе *Рыгору XVI* аб рэлігійнай сітуацыі на Бліжнім Усходзе, дорыць музею Ватыкана калекцыю археалагічных знаходак і прадстаўляе праект маладзёвага каталіцкага калегіўма з роспісам выдаткаў на яго ўтрыманне.

У 1839-41 гг. М. Рыла ўзначальвае езуіцую місію ў Сірыі, адчыняе ў Бейруце Collegium Asiaticum (Азіяцкі каталіцкі калегіўм), з разнастайнымі навучальнымі класамі, тыпаграфіяй і музеям. Там навучаецца больш за 100 юнакоў (у 1875 г. установе надаецца статус універсітэта св. Язэпа/Іосіфа).

У 1841-43 гг. Максіміліян Рыла - місіянер на Мальце, дзе ён арганізоўвае каталіцкую школу для хлапчукоў. А ў 1843-44 гг. ён ужо прапаведнік на востраве Сіцылія.

У 1844 г. Максіміліян Рыла на два гады становіцца рэктарам Рымскага калегіюма (*Collegium Urbanum*) Кангрэгацыі прапаганды веры. У 1854 г. прыназначаецца папам *Піям IX* апостальскім вікарыем Цэнтральнай Афрыкі ў сталіцы Судана - горадзе Хартум.

У 1848 г. М. Рыла здзяйсняе падарожжа ў Каір і Александрыю. Расейскі вандроўнік *Е.П. Кавалеўскі*, які сустракаецца ў Хартуме з М. Рыла, адзначае яго эрудыцыю і, у прыватнасці, добрае веданне расейскай літаратуры.

Памірае Максіміліян Станіслаў Рыла пад час місіянерскай паездкі. Спачатку быў пахаваны на мясцовых могілках г. Хартум. У 1899 г. (па іншых звестках – у 1900 г.) яго парэшткі былі ўрачыста перанесены ў Каір на на каталіцкія могілкі.

Максіміліян Рыла пакінуў адметны след ў гісторыі сусветнай культуры.





**Парэшткі Вавілона**




**Бейруцкі ўніверсітэт св. Язэпа/Юзафа/Іосіфа**



**Духоўныя практыкаванні па метаду св. Ігнацыя Лоёлы**
**(Мінск – з 2-га па 7-е студзеня 2018г. а 13.00)**

Ён (М. Рыла) быў першым з даследчыкаў, хто азнаёміўся з парэшткамі старажытнага Вавілона; ён фактычна заснаваў сучасны Бейруцкі ўніверсітэт; ім апублікаваны каментар да кнігі заснавальніка Ордэна езуітаў *Ігнацыя Лаёлы* (*1491-1556*) «Духоўныя практыкаванні» («*Exercitia Spiritualia*»). Але на сёняшні дзень ў якасці памяці пра Максіміліяна Рылу *мы* маем усяго толькі чатыры невялікія публікацыі за апошнія 170 гадоў (свой сціплы нарыс у кнізе "Известные уроженцы Гродненской области" (серыя "Факел истины", Гродна: ЮрСа-Прынт, 2016, с. 188-190), я не ўлічваю):

*Koscialkowski S. O.* Maksymilian Ryllo, T. J. 1802–1848 - Bejrut, 1946 (Даведка: *Станіслаў Касцялкоўскі*, гісторык, ураджэнец Гродна, сын вядомага гродзенскага ўрача Язэпа/*Юзафа Касцялкоўскага*, прафесар Віленскага ўніверсітэта, аўтар знакамітай манаграфіі пра *Антонія Тызенгаўза*);

*Karol A.* Jezuita romantyczny – o. Maksymilian Ryllo.- Krakow, 1992;

Цякала Н. М. Ад Падароска да вярхоўяў Ніла: да 200-годдзя з дня нараджэння Максіміліяна Рыла. - Ваўкавыск: Ваўкавыская цэнтральная бібліятэка, 2002;

Першы даследчык Вавілона//*Свіслацкая газета*. – Ваўкавыск: 2008. – Вып. 20 мая.

Плюс сціплая інфармацыя ў Сеціве. Каментары не патрэбныя.

***Алесь Госцеў*, адміністратар музейнага комплекса ліцэя №1 г. Гродна, старшыня клуба інтэлектуальнага развіцця "Паходня ісціны" пры ДУК "Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна".**

**Матэрыял падрыхтаваны пры актыўным удзеле сяброў Клуба *Дзяніса Нарэля* і *Алеся Перагудава*.**